А. Чарвякоў

# Вышэй сцяг советаў

Советы з'яўляюцца самымі масавымі арганізацыямі, праз якія рабочы клас, калгаснікі і ўсе працоўныя прымаюць непасрэдны ўдзел у кіраўніцтве дзяржавай і праз якія ажыццяўляецца кіруючая роля рабочага класа ў справе соцыялістычнага будаўніцтва.

Надыходзячая кампанія перавыбараў советаў з'яўляецца адказнейшай масавай палітычнай кампаніяй па далейшаму ўмацаванню советаў. Для паспяховага яе правядзення патрэбна агромная мабілізацыя і напружанне сіл усіх совецкіх, партыйных і грамадскіх арганізацый.

У БССР налічваецца каля трох мільёнаў выбаршчыкаў, якія карыстаюцца правамі выбіраць і самі могуць быць абраны ў советы, і якіх неабходна прыцягнуць да актыўнага ўдзелу ў пераабранні советаў.

Уся гэта маса выбаршчыкаў аб'ядноўваецца і прымае штодзенна ўдзел у кіраванні дзяржавай праз сваіх дэпутатаў, якія ўваходзяць у склад 1477 сельсоветаў, 32 гарадскіх советаў, 72 РВК і цэнтральных арганізацый—ЦВК і СНК БССР.

Асноўны актыў совета складаюць члены—дэпутаты советаў. Усяго ў склад советаў абрана ў 1931 годзе—45.441 дэпутат. Акрамя таго, у пастаянную работу ў советах праз секцыі і дэпутацкія групы ўцягнута яшчэ значная колькасць рабочых і калгаснікаў.

Пры арганізацыі сельсоветаў належная ўвага звернута на абслугоўванне працоўных нацыянальных меншасцей на іх роднай мове. З гэтаю мэтай у БССР арганізаваны і працуюць 40 польскіх, 24 яўрэйскія, 24 рускія, 16 украінскіх, 5 латышскіх, 2 нямецкія і 1 літоўскі советы.

З часу апошніх перавыбараў советаў адбыліся каласальныя змены ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага жыцця нашай рэспублікі.

Перамогі, з якімі БССР ідзе к перавыбарам советаў, ёсць трыумф ленінскай нацыянальнай палітыкі. Гэтыя перамогі атрыманы ў жорсткай барацьбе супроць беларускага контррэволюцыйнага нацыянал-дэмакратызма і вялікадзяржаўнага шавінізма. Гэтыя перамогі ярчэй і лепш за ўсё выкрываюць і разбіваюць ушчэнт усе дамаганні беларускіх нацыянал-дэмакратаў, ускрываючы ў аголеным і агідным выглядзе іх контррэволюцыйную сутнасць. **Беларусь магла дабіцца пышнага росквіту гаспадаркі і культуры толькі як рэспубліка советаў, як неадлучная частка вялікага Совецкага союза.**

Асабліва значныя змены адбыліся ў сельскай гаспадарцы ў рэзультаце барацьбы за яе соцыялістычную рэканструкцыю. Замест 17 проц.

калектывізацыі і 4.112 калгасаў на 1 студзеня 1931 года, Совецкая Беларусь налічвае на 1 жніўня 1934 г. 9.820 калгасаў і 55,3 працанта калектывізацыі. Пасеўная плошча калгасаў складае 60,8 проц. усёй пасеўнай плошчы замест 33,8 проц. на 1 студзеня 1931 г. БССР за гэты час многага дабілася ў галіне механізацыі сельскай гаспадаркі. Замест 30 МТС з 1.006 трактарамі (без соўгасаў) у 1931 годзе, у гэтым годзе БССР мае 76 МТС з 2.120 трактарамі. Акрамя таго, соўгасы Наркамзема маюць 338 трактароў і соўгасы Наркамсоўгасаў маюць 993 трактары.

У межах БССР у гэтым годзе налічваецца каля 400 жывёлагадоўчых, насенаводчых і іншых спецыялізаваных соўгасных гаспадарак.

Ідзе хуткі рост малочна-таварных, свіна-таварных, а з гэтага года і аўцагадоўчых калгасных ферм са значным ростам пагалоўя ў гэтых фермах. Вялікая работа праводзіцца ў калгасах па захаванню маладняка і падрыхтоўцы жывёлагадоўчых ферм да надыходзячай зімы. Разам з тым заканчваецца практычнае ажыццяўленне дырэктывы партыі і ўрада аб тым, каб кожны калгаснік меў сваю карову.

Гэтыя агромныя поспехі ў справе соцыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ўжо прыносяць свае дадатныя вынікі.

Не выпадкова-ж Совецкая Беларусь перавыканала план вясенняй сяўбы, паспяхова правяла праполачную і ўборачную кампаніі і выканала ў гэтым годзе абавязковы план зернапаставак дзяржаве да 5 верасня, раней устаноўленага тэрміна і зярном добрай якасці. Гэта з'явілася, галоўным чынам, рэзультатам таго, што ў працэсе ўзмоцненай барацьбы за большэвіцкія калгасы, калгасы Совецкай Беларусі настолькі ўздужалі, вырасцілі такі значны і адданы калгасны актыў, што калгасы, як правіла, з'явіліся перадавікамі ў барацьбе за выкананне гэтага і іншых дзяржаўных абавязацельстваў.

Апіраючыся на калгасы і калгасны актыў, советы паспяхова разгарнулі работу сярод аднаасобнага сектара.

Абсалютная большасць калгасаў БССР пасля выканання ўсіх дзяржаўных абавязацельстваў, засыпкі насенных, страхавых і іншых фондаў здолеюць дастаткова забяспечыць жыццё саміх калгаснікаў, якія на справе ўжо ў гэтым годзе ажыццёвяць лозунг тав. Сталіна аб заможным жыцці. Вось чаму восень гэтага года азнаймавалася далейшым значным ростам калектывізацыі.

Мінулыя гады былі гадамі ўпорнай класавай барацьбы. Класавы вораг, разбітыя і выкрытыя, але недабітыя нацыянал-дэмакраты аказвалі жорсткае супраціўленне стварэнню і ўмацаванню калгасаў, выкананню дзяржаўных абавязацельстваў.

Барацьба за соцыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, за большэвіцкія калгасы і за заможнага калгасніка і з'яўляецца важнейшай задачай і праверкай работы сельсоветаў.

Там, дзе сельсоветы разумелі, што лінія партыі і совета адна, дзе советы на справе змагаліся за генеральную лінію партыі, дзе сельсовет з'яўляўся моцнай цытадэляй большэвізма,—там класавы вораг быў своечасова выкрыт, разбіт, выкінут з советаў, з калгасаў, там паспяхова разгортвалася калектывізацыя, калгасы на справе ператвараліся ў большэвіцкія, там своечасова выконваліся дзяржаўныя абавязацельствы і калгаснік упэўнена і цвёрда ішоў к заможнаму жыццю. І, наадварот, у тых выпадках, дзе ў советы пранікалі прамыя класавыя ворагі, агенты кулацтва, апартуністы, нацыянал-дэмакраты, гнілыя лібералы,—у тым совеце калгасы прадастаўляліся самім сабе і без кіраўніцтва ператвараліся часта ў арэну беспакаранай дзейнасці

контррэволюцыянераў. Тут на справе пацвярджаліся словы тав. Сталіна:

> «Справа не толькі ў советах, як у форме арганізацыі, хоць сама гэта форма прадстаўляе найвялікшую рэволюцыйную заваёву. Справа перш за ўсё ў змесце работы советаў, справа ў характары работы советаў, справа ў тым, хто іменна кіруе советам—рэволюцыянеры ці контррэволюцыянеры».

Разам са зменай характару сельскай гаспадаркі, якая перабудоўваецца з аднаасобнай у калгасную, ішло змяненне складу сельсоветаў. Замест 25 проц. калгаснікаў, абраных дэпутатамі сельсоветаў у 1931 годзе, колькасць членаў сельсоветаў-калгаснікаў у 1934 годзе ўзнялася да 53,4 проц. Гэтыя змены ў складзе членаў сельсоветаў адбыліся як за кошт таго, што абраныя ў сельсоветы ў 1931 годзе аднаасобнікі, з'яўляючыся лепшымі, адданымі партыі і совецкай уладзе перадавікамі, за гэты час самі сталі калгаснікамі, а таксама за кошт таго, што рад членаў сельсоветаў не апраўдалі сябе за час работы ў совеце, аказаліся чуждымі і былі адклікаены са складу сельсоветаў, а замест іх былі даабраны адданыя справе партыі і соцыялістычнага будаўніцтва калгаснікі-ўдарнікі.

Увага партыі і ўрада ўвесь час была накіравана на тое, каб усямерна ўзмацніць сельсоветы. З гэтаю мэтай пад сельсоветы была падведзена моцная матар'яльная база. Замест 333 сельсоветаў, меўшых самастойны бюджэт у 1931 годзе, у 1934 годзе ўсе 1.477 сельсоветаў маюць свой самастойны бюджэт. Кіруючы склад сельсоветаў за гэты час значна ўзмоцнен за кошт накіравання ў вёску для сталай работы работнікаў з ліку раённага актыва. Значна палепшана матар'яльнае становішча работнікаў сельсоветаў. Такім чынам барацьба за соцыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі з'яўлялася ў той-жа час барацьбой за далейшае ўмацаванне сельсоветаў, за ачыстку сельсоветаў ад чуждых, прымазаўшыхся элементаў, ад агентаў класавага ворага, за папаўненне советаў за кошт лепшых і адданых калгаснікаў з ліку калгаснага актыва.

Дзякуючы прынятым мерам па ўмацаванню сельсоветаў, цэлы рад раёнаў і сельсоветаў, якія ішлі да гэтага з глыбокімі прарывамі, сталі раёнамі і советамі перадавымі, сістэматычна і своечасова выконваючымі ўсе свае абавязацельствы. Оршанскі, Слуцкі, Чэрыкаўскі, Чырвона-Слабодскі, Менскі і рад іншых раёнаў, а таксама Ерамкоўскі сельсовет, Оршанскага раёна, Баярскі сельсовет, Полацкага раёна, Бычынскі і Кішчына-Слабодскі сельсовет, Барысаўскага раёна, і вялікая колькасць іншых сельсоветаў, заваяваўшых сабе цвёрдае месца сярод перадавых раёнаў і сельсоветаў БССР, служаць лепшым гэтаму довадам.

Вельмі значны поспехі Совецкай Беларусі ў справе прамысловага будаўніцтва. За мінулы час закончан будоўляй і пушчан у эксплаатацыю рад новых буйных прадпрыемстваў, а таксама значна рэканструяваны і пашыраны існуючыя прадпрыемствы. Значна павялічылася колькасць рабочых на фабрыках і заводах. Валавая прадукцыя прамысловасці, якая складала ў 1930 г. 35 проц. усёй прадукцыі народнай гаспадаркі, у 1933 годзе складала 60 проц. Гэта гаворыць аб тым, што БССР ператварылася ў краіну індустрыяльна-аграрную.

Поспехі БССР у галіне індустрыялізацыі таксама знаходзяцца ў залежнасці ад работы советаў і ў першую чаргу горсоветаў. Там, дзе горсоветы самі праз секцыі, дэпутацкія групы займаюцца пытаннямі

прамысловага будаўніцтва і работай прамысловых прадпрыемстваў, там барацьба за промфінплан, за палепшанне матар'яльната, культурна-бытавога становішча рабочых працякае паспяхова. І наадварот, прарывы ў рабоце прадпрыемстваў заўсёды і немінуча звязаны з недаацэнкай гэтай работы советамі, з адсутнасцю арганізацыйна-масавай работы ў советах.

Да таго часу, пакуль віцебскі горсовет мала займаўся пытаннямі прамысловасці, віцебская швэйная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі», ды і іншыя фабрыкі, працавалі вельмі дрэнна. Калі-ж, побач з іншымі мерамі, прынятымі для аздараўлення і палепшання работы фабрыкі. горсовет разгарнуў масавую работу на прадпрыемстве, арганізаваў дэпутацкія пасты, дэпутацкія групы, устанавіўшы сістэматычную сувязь прадпрыемстваў праз тэтыя пасты і групы з прэзідыумам горсовета, дзякуючы чаму горсовет змог своечасова прыходзіць на дапамогу фабрыцы,—гэта фабрыка паспяхова вышла з прарыву.

Асабліва яркі прыклад значэння масавай работы горсоветаў дае праводзімы конкурс советаў на лепшае аказанне дапамогі чыгуначнаму транспарту. Цэлы рад сур'ёзнейшых задач, вырашэнне якіх сіламі саміх чыгунак было-б надзвычай затруднена, аказаліся лёгка вырашальнымі, калі на дапамогу прышлі советы, мабілізаваўшы для гэтай мэты свой актыў і сродкі. Прывядзенне ў парадак стрэлак, вартаўнічых будак, барацьба за пад'яздныя шляхі, за чыстату на станцыях чыгунак, за лепшае абслугоўванне пасажыраў, за палепшанне кватэрных умоў, а таксама снабжэння чыгуначнікаў і цэлы рад іншых задач паспяхова вырашаюцца пры ўдзеле горсоветаў. Менскі, Віцебскі, Оршанскі, Барысаўскі і іншыя горсоветы ўпорна дамагаюцца першынства ў гэтым спаборніцтве. Барысаўскі горсовет здолеў ужо заваяваць сабе першае месца сярод горсоветаў БССР.